# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Зяноўкі Яўгеніі Сяргееўны «Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі», прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка

Ад распрацоўшчыкаў розных краін час ад часу з'яўляюцца паведамленні аб дасягненні фенаменальнай эфектыўнасці ў аўтаматычным агучванні пісьмовых тэкстаў, але ўсё ж ніводная з існуючых сістэм не можа быць ахарактарызавана як ідэальная, кожная мае тыя ці іншыя абмежаванні. Кола праблем, што неабходна яшчэ вырашыць для паляпшэння працы сінтэзатараў маўлення, вельмі шырокае, і сярод іх па актуальнасці на першым месцы знаходзіцца задача фарміравання якасных лінгваакустычных рэсурсаў (ЛАР), бо яны з'яўляюцца асновай для генерацыі натуральнага гучання і інтанацыі, адпаведнай мэце выказвання. Натуральнасць жа агучвання інфармацыі сінтэзатарам забяспечвае яе зразумеласць, а саму камунікацыю, апасродкаваную машынай, робіць камфортнай, што прынцыпова важна для карыстальнікаў з абмежаванымі магчымасцямі (напрыкдад, для людзей з парушэннямі слыху, маўлення, зроку, дробнай маторыкі і інш.), а таксама для спецыялістаў, якія займаюцца клінічнымі даследаваннямі. Адзначанае поўнасцю адносіцца і да беларускамоўных сінтэзатараў маўлення (БСМТ), распрацаваных у АІПІ НАН Беларусі. У гэтым святле дысертацыйная праца Яўгеніі Сяргееўны Зяноўкі, у якой якраз і пастаўлена мэта сфарміраваць і аптымізаваць ЛАР у сістэмах сінтэзу маўлення з улікам рытміка-меладычнай структуры беларускай літаратурнай мовы, мае несумненную актуальнасць.

Як сведчыць змест аўтарэферата, даследаванне праведзена ў адпаведнасці з пастаўленай мэтай і задачамі, якія, на наш погляд, паспяхова вырашаны дзякуючы грунтоўнай навуковай базе (211 пазіцый спіса выкарыстанай літаратуры), прыцягненню рэпрэзентатыўнай колькасці фактычнага моўнага матэрыялу (1 000 камунікатыўна-сінтаксічных адзінак) і галоўнае – удаламу спалучэнню логікі міждысцыплінарнага і дысцыплінарнага даследаванняў, адлюстраванай у аўтарскай методыцы і працэдурнай арганізацыі спецыяльных міжгаліновых ведаў – лінгвістычных асноў беларускай прасодыі і камп'ютарных тэхналогій штучнага маўлення.

Вынесеныя на абарону чатыры палажэнні раскрыты ў трох главах (шасці раздзелах): у першай главе зроблены аналітычны агляд навуковай літаратуры па абранай тэме, прааналізаваны інтанацыйныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы, апісаны праблемы функцыянавання сістэм сінтэзу маўлення па тэксце і вызначаны прычыны невысокага ўзроўню якасці штучнага агучвання ў інтэрнэт-версіі БСМТ; у другой главе апісаны патэнцыял выкарыстання ЛАР у складзе лінгваакустычнай базы даных і вызначаны асаблівасці фарміравання сістэматызаваных ЛАР беларускай літаратурнай мовы; у трэцяй главе прадстаўлены ўстаноўленыя аўтарам даследавання

заканамернасці сінтагмападзелу беларускага маўлення на аснове сукупнасці сродкаў і правіл утварэння сінтаксічных адзінак, апісана тэхналогія ўбудавання ЛАР у беларускамоўныя сістэмы сінтэзу маўлення і мн. інш.

Вывады, зробленыя ў заключэнні, суадносяцца з асноўным зместам дысертацыйнай працы і адпавядаюць пастаўленым у ёй задачам.

Неабходна падкрэсліць навуковую навізну дысертацыйнага даследавання і яго высокую практычную значнасць. Упершыню прасадычныя характарыстыкі сучаснай беларускай літаратурнай мовы сістэмна даследаваны з прымяненнем камп'ютарных праграм, і ўпершыню ў айчынным мовазнаўстве вынікі гэтага даследавання атрымалі практычную рэалізацыю ў лінгваакустычных рэсурсах у складзе сістэм сінтэзу маўлення. Лінгваакустычная база даных, створаная аўтарам дысертацыі, ужо прымяняецца ў беларускамоўным прасадычным модулі праграмнага комплексу «IntonTrainer» і інш. Несумненна, што напрацоўкі Я.С. Зяноўкі, зробленыя ў ходзе дысертацыйнага даследавання, будуць садзейнічаць актывізацыі вырашэння тэарэтычных і прыкладных праблем беларускай прасодыі.

Аўтарэферат адпавядае патрабаванням Інструкцыі ВАК Рэспублікі Беларусь, яго змест сведчыць аб тым, што дысертацыйнае даследаванне Я. С. Зяноўкі «Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі» – гэта грунтоўная, выкананая на высокім навуковым узроўні і закончаная кваліфікацыйная праца, што дае падставы прысвоіць яе аўтару вучоную ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка.

Дацэнт кафедры беларускай філалогіі
установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны
тэхналагічны ўніверсітэт»
кандыдат філалагічных навук А. А. Кірдун

А. А. Кірдун

13 04 2025